А ВОЗ І СЁННЯ ТАМ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Аднак дэпартамент інфарматызацыі Міністэрства сувязі, адказны як за гэта мерапрыемства, так і за ўсю падпраграму «Электронны ўрад», павёў сябе дзіўным чынам. Нягледзячы на дзяржаўную важнасць задачы, на адпаведныя распараджэнні вышэйшых службовых асоб дзяржавы, на працягу першага паўгоддзя 2011 года Міністэрства сувязі не прыняло ніякіх неабходных захадаў па арганізацыі выканання работ і нават не вызначыла канкрэтнага выканаўцу, — паведаміў начальнік упраўлення інфармацыйных рэсурсаў і тэхналогій Сакратарыята Савета Рэспублікі Аляксандр НОВІК. — Толькі пасля нашага пісьмовага звароту да прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Міхаіла Мясніковіча «Аб нездавальняючым правядзенні работ па развіцці АІС «Мясцовыя Саветы дэпутатаў», адпраўленага 30 жніўня мінулага года, пачаліся некаторыя зрухі.

У кастрычніку, па словах Аляксандра Новіка, быў, нарэшце, вызначаны выканаўца работ па мерапрыемстве № 15 падпраграмы «Электронны ўрад» — ім стаў Аб'яднаны інстытут праблем інфарматыкі Нацыянальнай акадэміі навук. Канчаткова ж дагавор паміж Мінсувязі і гэтым інстытутам быў падпісаны толькі... 22 снежня 2011 года.

У выніку для развіцця АІС «Мясцовыя Саветы дэпутатаў» мінулы год быў цалкам страчаны ў той частцы, якая датычыцца мерапрыемства №15, канстатаваў Аляксандр Новік. Ён, аднак, выказаў спадзяванне, што ўсе работы, якія датычацца інфармацыйнага ўзаемадзеяння паміж мясцовымі Саветамі дэпутатаў і арганізацыямі раённага ўзроўню, будуць выкананы ў 2012 годзе. І дадаў, што, на жаль, «пакуль яшчэ не заўважана неабходнай актыўнасці з боку Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі НАН у гэтым кірунку».

— Нашай задачай было разгарнуць гэтую працу, давесці яе да стану ўкаранення. А далей ёю неабходна займацца на ўзроўні рэгіёнаў, прычым займацца пастаянна, — заўважыў Анатоль Рубінаў. І прапанаваў сабраць па гэтым пытанні асобную нараду з удзелам кіраўніцтва абласцей і Міністэрства сувязі.

На пасяджэнні былі ўручаны Ганаровыя граматы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь дырэктару Вылічальнага цэнтра Брэсцкага абласнога ўпраўлення статыстыкі Віктару Марозу і дырэктару Магілёўскага рэгіянальнага інфармацыйнага цэнтра Сяргею Вайцэховічу — за вялікі асабісты ўклад у стварэнне і развіццё сістэмы АІС «Мясцовыя Саветы дэпутатаў».

— Гэта якраз той выпадак, калі ўзнагарода заслужана ў поўнай меры і без усялякіх агаворак. Асабліва гэта датычыцца брэсцкага вылічальнага цэнтра і яго кіраўніка Віктара Мароза, у якога слова не разыходзіцца са справай, — падкрэсліў Аляксандр Новік.

Ад рэдакцыі. ***Усю інфармацыю пра АІС «Мясцовыя Саветы дэпутатаў» зацікаўленыя могуць атрымаць на сайце Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання па электронным адрасе: www.sovreg.gov.by (раздзел: АІС «Мясцовыя Саветы дэпутатаў»).***

ПАД АБЛОМКАМІ ДАХУ...

У Глыбоцкім раёне ў вёсцы Стуканы падчас пажару загінула 87-гадовая бабуля. У выніку пажару абрынуўся дах дома, пад абломкамі будаўнічых канструкцый знайшлі цела гаспадыні, пенсіянеркі.

Жанчына жыла адна, ад перасялення ў бальніцу сястрынскага догляду адмовілася. Дапамагала ёй па гаспадарцы сацыяльны работнік. Па папярэдніх звестках, прычынай пажару стала парушэнне правілаў эксплуатацыі печы.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

МЯСЦОВЫ ЧАС

ПАМІЖ ПУШЧАМІ — БЕЛАВЕЖСКАЙ І РУЖАНСКАЙ



Спецыяліст сельсавета Зоя БАРЫСІК.

На стале ў Зоі Барысік — стос анкет, іншых папер для замены пашпартоў. Хто мяняе дакументы, хто атрымлівае іх у першы раз, і ўсе ідуць да спецыяліста сельвыканкама. Не так даўно гэтую работу Зоя Аляксандраўна выконвала з асаблівым задавальненнем — запаўняла анкету на пашпарт для Марыі Іосіфаўны Якаўчук. Летась старэйшая жыхарка вёскі адзначыла 100-гадовы юбілей.

Вядома, Марыю Іосіфаўну павіншавалі, падарунак зрабілі. А праз некаторы час зноў наведалі, каб пашпарт новы ўручыць. Гэта была прыемная місія, бо ўдаву франтавіка Марыю Якаўчук у вёсцы вельмі паважаюць. І ёсць за што. З вайны не дачакалася мужа, дзяцей узняла на ногі адна. Усё жыццё працавала на калгасных і сваіх палетках. Мае восем унукаў, колькасць праўнукаў увогуле набліжаецца да двух дзясяткаў. Яшчэ і цяпер 100-гадовая жанчына займаецца дробнымі хатнімі справамі.

Рэарганізацыя

Шэсць гадоў таму правялі рэарганізацыю, і тэрыторыя Лыскаўскага сельсавета далучылася да Зеляневіцкага. А ў Лыскаве для зручнасці насельніцтва пакінулі спецыяліста сельвыканкама Зою Барысік. У зону яе абслугоўвання ўваходзіць шэсць вёсак, у якіх пражывае 592 чалавекі. Для такой колькасці людзей утрымліваць асобны сельвыканкам немэтазгодна, таму і была праведзена «аптымізацыя». Жыхары вёсак, з кім давялося перамовіцца, адзначалі, што перамен у горшы бок яны асабліва і не адчулі. Можа, таму, што «свой» спецыяліст застаўся, і патрэбную даведку заўсёды можна ўзяць без праблем. За гэтым найбольш і звяртаюцца ў «сельсавецкі пакой».

— Кожны дзень людзі ідуць, — расказвае Зоя Аляксандраўна. — Аднаму трэба даведку пра склад сям'і, другому — пра наяўнасць асабістай падсобнай гаспадаркі. Зімой наведнікаў менш. Вясной жа людзі хочуць трапіць у спісы на пасадку бульбы, восенню — на нарыхтоўку паліва. Звяртаюцца па старой звычцы з усімі пытаннямі: то святло на вуліцы не гарыць, то снег своечасова не прыбіраецца з тратуараў. Калі праблему нельга вырашыць на месцы, пераадрасоўвае яе ў сельвыканкам.

Адметнасці вялікай тэрыторыі

Старшыня Зеляневіцкага сельскага Савета Антаніна Лагач не сумняваецца, што асноўнай функцыяй мясцовай улады была і застаецца работа з людзьмі. Сельсавет, у склад якога ўваходзяць 24 населеныя пункты, расцягнуты з усходу на захад больш як на 20 кіламетраў. Мяне здзівіла, што на асабістых падворках тут засталося ўсяго 10 кароў. Чатыры з іх трымаюць бацькі шматдзетнай сям'і, і шэсць рагуль прыпадае на ўсе астатнія двары. Антаніна Васільеўна кажа, што мода збываць жывёлу прыйшла з багацейшых раёнаў Гродзеншчыны, з якімі сельсавет мяжуе. Там з даўніх часоў былі моцныя гаспадаркі, людзі атрымлівалі добрую зарплату і маглі не абцяжарваць сябе штодзённым клопатам пра карову. На сітуацыю паўплывала і беднасць сваіх сельгаспрадпрыемстваў. Спрадвеку на гэтых землях з самай нізкай бальнасцю глебы былі калгасы, якія адставалі. Ніхто не дапамагаў прыватнікам нарыхтоўваць кармы, не праяўляў клопату пра іх асабістыя агароды. Як вынік, людзі сталі збываць буйную рагатую жывёлу. Цяпер павярнуць іх свядомасць у супрацьлеглы бок няпроста. Знайшлася адна сям'я, якая са сваіх чатырох кароў мае стабільны даход. Але ж гэта — праца ад цямна да цямна. Таму і няма ахвотных браць з іх прыклад.

Тым больш што ў Зеляневіцкую краму праз дзень завозяць разнастайныя малочныя прадукты, тварог тут прадаецца крыху даражэй, чым па 2 тысячы рублёў за пачак. А малако, даражэйшае, чым па 3 тысячы за літр, месцічы і браць не спяшаюцца. Каму не хапае таннага, той наведвае суседнія вёскі Гродзенскай вобласці. Там малочныя прадукты таннейшыя, аўтарытэтна заявілі мне наведніцы сельскай крамы. І іх падтрымалі прадаўцы.

Не сказаць, што тут людзі гультаяватыя. Але так склалася, што кароў не трымаюць. Тая ж Зоя Барысік асабіста спрабавала падбухторыць маладых гаспадынь з новай вуліцы завесці кароў. Некаторыя нават і не супраць. Толькі пры ўмове, каб знайшлося такіх сем'яў з дваццаць, бо пасвіць уласны статак кожны тыдзень працуючым вяскоўцам нявыгадна. Так што добрая справа адкладваецца да той пары, пакуль знойдзецца больш добраахвотнікаў. Але цікава, што па вёсках, дзе трымаюць адну-дзве каровы, усё роўна штодня праходзіць малакавоз з малочнага камбіната і забірае малако. Хоць гэтыя рэйсы для прадпрыемства відавочна стратныя, затое людзей не крыўдзяць.

Яшчэ адна адметнасць гэтай тэрыторыі — розніца ў працягласці жыцця паміж мужчынамі і жанчынамі складае 9 гадоў, у Зеляневіцкім сельсавеце, паводле апошніх падлікаў, — 1 год. Старшыня сельскага Савета лічыць, што такая статыстыка — проста выпадковасць. Раней было інакш, сведчаннем таму вялікая колькасць адзінокіх бабуль, што засталіся ў вёсках. Сустрэчны вясковы дзядок, хітра падміргнуўшы, адказаў на гэтае пытанне не без гумару: маўляў, у іх лясным краі самагонка якасная, не п'юць мужыкі абы-чаго, вось і не паміраюць без пары.

І ў суд не падасі...

Лясы тут векавыя: з аднаго боку — Белавежская пушча, з другога — Ружанская. Аматары палявання едуць не толькі з розных раёнаў, але і розных краін. Звяроў хапае. А вось для вяскоўцаў і сельсавета гэта яшчэ адзін галаўны боль. Кожны год церпяць пасевы. Дзікія жывёлы з'ядаюць гектарамі бульбу, іншыя культуры. Калі на калгасным полі ўмоўнай плошчай 50 гектараў сапсуюць 1 гектар, то застанецца яшчэ 49. А калі чалавек са сваіх 30 сотак пасля такіх «набегаў» накапае два мяхі бульбы, то для яго гэта вялікая страта — на год сям'я застанецца без «другога хлеба». Антаніна Лагач расказала, як гады два таму яны спрабавалі шукаць рады, хацелі прыцягнуць да адказнасці лясныя гаспадаркі. Кансультаваліся з юрыстамі, стваралі камісіі па ацэнцы ўрону, складалі пратаколы, затым накіроўвалі іх у адпаведныя ўстановы з прапановай кампенсаваць урон. З адміністрацыі Белавежскай пушчы наогул ніякага адказу не прыйшло, а вось Пружанскі лясгас адказаў, што за захаванне ўраджаю адказныя самі гаспадары. Маўляў, няхай сядзяць ды пільнуюць свае соткі. Словам, падчас такой цяганіны грамадзяне пераканаліся, што заканадаўчай базы на гэты конт няма і ніхто ім не дапаможа. Паставіць жа агароджу вакол бульбяных плантацый ва ўмовах абавязковага севазвароту проста нерэальна.

Каму даверыць газонакасілку?

На пытанне, як праводзіцца добраўпарадкаванне, Антаніна Лагач адказала коратка: «Выкручваемся». Летась на гэтыя патрэбы было выдзелена 7 мільёнаў рублёў, сёлета яшчэ менш — 5. Праўда, у мінулым годзе вельмі пашанцавала вёсцы Лыскава. Пры будаўніцтве аб'язной дарогі вакол Белавежскай пушчы добраўпарадкавалі цэнтральную вуліцу вёскі, нават тратуары парабілі.

Ну а ў іншых населеных пунктах мясцовая ўлада стараецца нешта зрабіць сваімі сіламі. За добраўпарадкаванне могілак старшыня сельскага Савета ўдзячная свайму актыву — старастам, якія і сталі першымі памочнікамі. Яўген Цяслюк, староста з Магілёўцаў, Уладзімір Матвейчык, староста вёскі Рачкі, Мікалай Марковіч, староста Зіновіч вызначыліся не толькі ў асобных акцыях накшталт прыборкі могілак — яны заўсёды і ва ўсім дапамагаюць аднавяскоўцам.

Памочнікамі сельсавета ў гэтай справе таксама з'яўляюцца работнікі абласной псіхіятрычнай бальніцы, якая знаходзіцца ў вёсцы Магілёўцы. Па першай просьбе мясцовай улады галоўны ўрач Віктар Бычак звычайна дапамагае і працоўнай сілай, і тэхнікай. Супрацоўнікі медустановы ўплываюць і на культурнае жыццё вёскі. Яны завадатары многіх свят і мерапрыемстваў. А калі ўлічыць, што да райцэнтра адсюль амаль 60 кіламетраў, а да Ружан, бліжэйшага пасёлка, — 15, такое супрацоўніцтва ўяўляецца надзвычай патрэбным.

Старшыня Зеляневіцкага сельскага Савета кажа, што могілкі яны ў парадак прывялі, але яго трэба падтрымліваць пастаянна. Таму рашэннем выканкама вызначылі плату ў некалькі базавых велічынь чалавеку, які будзе выконваць гэтую работу па дагаворы. Але ў штаце ўсё роўна павінна быць хоць адна адзінка рабочага па добраўпарадкаванні, упэўнена Антаніна Васільеўна. У іх вялікія тэрыторыі, столькі падкошваць трэба летам! А дарагую газонакасілку нельга даверыць выпадковаму чалавеку. Такая тэхніка павінна быць у руках таго, хто за яе адказвае.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Пружанскі раён.

СЯМЕЙНЫ АЛЬЯНС

У межах разумнага

Ніхто не будзе папракаць людзей, якія сям'ёй працуюць на ферме. Напрыклад, муж — жывёлавод, а жонка з дачкой — даяркі. Наадварот, такую сямейнасць будуць толькі вітаць. А як быць, калі галава сям'і ўзначальвае буйное прадпрыемства, а пры ім жонка ці дзеці, іншыя сваякі займаюць пасады ў паралельных структурах?

Таццяна ШЧАРБАЦЭВІЧ.

Калі Крошынскі сельскі Савет Баранавіцкага раёна ўзначаліла Таццяна Шчарбацэвіч, многія ўспрынялі гэты факт насцярожана, бо Таццяна Пятроўна з'яўляецца жонкай старшыні мясцовага СВК «Крошын». Гэты выпадак нельга лічыць прэцэдэнтам, бо падобныя сямейныя саюзы маюць месца, хоць з'яўляюцца даволі рэдкай з'явай.

Аўтару гэтых радкоў неаднойчы даводзілася бываць у вёсцы Альсевічы, якая з усіх бакоў акружана палямі сельгаскааператыва «Крошын». Вёска напалову вымерла, але вясной ажывае, бо да бацькоўскіх хат прыязджаюць дзеці. Калі ў СВК прыйшоў Уладзімір Шчарбацэвіч, то распарадзіўся заараць усе пустуючыя лапікі зямлі (нават дарога ад электрычкі да Альсевіч стала вузейшай). І не дзіўна, што з прыходам у мясцовую ўладу жонкі Уладзіміра Дзмітрыевіча давялося пачуць: «Цяпер Шчарбацэвіч і сельсавет «падамне» пад сябе».

Асаблівых кантактаў з сельвыканкамам і СВК я не падтрымліваў. Але калі на вуліцы сапсавалася (паламалі) калонка, звярнуўся ў мясцовую «адміністрацыю» — сельвыканкам, і былы яго кіраўнік паабяцаў: «Зробім усё. Адрамантуем». Але мінуў год, затым другі, а вады ўсё не было. Вада ў калонцы заструменілася, калі сельсавет узначаліла жонка старшыні СВК. Можа, Шчарбацэвіч і «падмяў» сельсавет, але калонка цяпер адрамантавана і могілкі каля Альсевіч агароджаны. Вось і падумалася, што, магчыма, такі варыянт «сямейнага падраду» не горшы для людзей.

Крошынскі сельсавет і праўленне СВК «Крошын» знаходзяцца пад адным дахам. Зразумела, што шляхі абодвух кіраўнікоў перасякаюцца і на працы. Праблем у Таццяны Шчарбацэвіч хапае, і вырашаць іх было б складаней, калі б «пад рукой» не аказалася мужа. Могілкі на тэрыторыі сельсавета прыведзены ў парадак з дапамогай СВК, ды і ўвогуле, старшыні сельскага Савета цяпер не трэба шукаць бляшанку фарбы — выдасць сельгаскааператыў.

— Але ж дапамогі прашу не для сябе, а зыходжу з патрэб насельніцтва, — разважае Таццяна Пятроўна, — і не трэба думаць, што я «дадатак» да мужа. Свой аўтарытэт заваёўваю сама, хоць людзі і ведаюць, чыя я жонка.

Характар чалавека ў значнай ступені вызначае яго лёс. Менавіта актыўная жыццёвая пазіцыя кіраўніка сельсавета дапамагла заваяваць той самы аўтарытэт.

Крама ў Крошыне належыць спажыўкааперацыі, але старшыня сельскага Савета палічыла, што прадаўцы не надта дбаюць пра пакупнікоў, і... навяла ў краме парадак. Зноў жа, здавалася б, якое дачыненне мае сельскі Савет да чыгуначнага прыпынку? Але Таццяна Пятроўна выйшла на начальніка Баранавіцкага аддзялення чыгункі, і прыпынак абнавіўся. У садку-яслях запланавана ўвесці нават групу выхаднога дня — каб людзям было зручна. Хоць і не ўсім работнікам садка гэта падабаецца.

Магчыма, старшыня мясцовай улады паказвае характар, бо адчувае за спінай «дыханне» мужа і яго падтрымку. Напэўна, калі б СВК «Крошын» не быў адной з лепшых гаспадарак раёна і не меў толькі ад малака 100 мільёнаў рублёў за дзень, сітуацыя была б крыху іншай. А так — чаму б не скарыстацца дапамогай сельгаскааператыва?

Уладзімір ШЧАРБАЦЭВІЧ.

Праўда, Уладзімір Шчарбацэвіч лічыць, што гаспадарка — не дойная карова. Але куды падзенешся, калі жонка просіць, а на тэрыторыі сельсавета жывуць людзі, якія робяць агульную справу. Тым не менш, лічыць старшыня СВК, дапамагаць трэба ў межах разумнага, і пры гэтым тыя, хто працуе ў гаспадарцы, павінны мець права на асаблівае да сябе стаўленне, на большую падтрымку і дапамогу.

Па статусе старшыня сельскага Савета вышэй за кіраўніка сельгаскааператыва, але ў апошняга ёсць грошы. А сельвыканкам калі якія і здабудзе, то аддае іх раёну ды чакае...

Дарэчы, пра грошы. Вось паехала Таццяна Шчарбацэвіч у Расію і даведалася, што кіраўнік сельсавета атрымлівае там зарплату 1,5 тысячы долараў у эквіваленце. Але гэта да слова, бо ў расійскай глыбінцы праблем хапае. Як і ў іншай, дарэчы.

Летам Уладзімір Дзмітрыевіч просіць Таццяну Пятроўну, каб яна падчас уборачнай не ўцягвала яго ў гаспадарчыя праблемы сельсавета. Жонка прыслухоўваецца.

Вось такая «сямейнасць» на асобна ўзятай тэрыторыі.

І ўсё ж ёсць пытанне. Яшчэ ў савецкі час у нас вялася барацьба з сямейнасцю і кумаўством — хацелі іх зжыць. Сёння склалася крыху іншая сітуацыя. З'явіўся прыватны сектар, дзе свой расклад. Прыватнік на ўласнае прадпрыемства можа ўладкаваць хоць усю радню, гэта яго справа. А вось у дзяржаўным сектары ўсё больш складана.

У Ляхавіцкім раёне працуюць бацька з сынам. Першы — старшыня СВК, другі — галоўны аграном. Гаспадарка моцная, сын неаднаразова выходзіў пераможцам у абласных і рэспубліканскіх спаборніцтвах... А вось яшчэ адзін факт. Старэйшы брат трыццаць гадоў узначальваў адну з лепшых у вобласці гаспадарак, вывеў яе ў лідары. А калі малодшы заняў пасаду кіраўніка райвыканкама, то на нейкім там узроўні ўбачылі ў гэтым «сямейнасць». Але здаровы сэнс, дзякуй Богу, перамог, людзі нармальна працуюць далей.

Напэўна, на падобныя сітуацыі мы павінны глядзець не праз прызму сямейнасці, а факусіруючы ўвагу на канкрэтным чалавеку. Важна не тое, у якой сям'і ён выгадаваўся, а на што здольны.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.
Фота аўтара.

ПАД ПІЛЬНЫМ «ВОКАМ»

На Віцебшчыне вырашылі прадухіляць крадзяжы на будаўнічых пляцоўках пры дапамозе сродкаў відэаназірання.

Як адзначыў начальнік упраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Найдэнка, добра, што цяпер агароджы вакол тэрыторыі будаўніцтва ўстанаўліваюць амаль што на ўсіх аб'ектах. Але гэтага недастаткова. Плануецца ініцыяваць устаноўку на будаўнічых пляцоўках камер для назірання.

Зараз на Віцебшчыне функцыянуе больш за 4,6 тысячы камер відэаназірання. На канец 2010 года іх было 2,8 тысячы штук. Камеры ўстанаўліваюцца паэтапна ў месцах масавага знаходжання людзей. Адпаведнае рашэнне было прынята на ўзроўні кіраўніцтва віцебскага аблвыканкама. Больш за пяцьдзясят камер перадаюць «карцінку» на працоўнае месца дзяжурнага УУС аблвыканкама. Камеры ў абавязковым парадку ўстанаўліваюцца перад здачай аб'ектаў грамадскага прызначэння, у тым ліку і крам. Толькі на Лядовым палацы ў Оршы, які плануецца адкрыць ужо летам бягучага года, будзе ўстаноўлена больш за трыццаць камер відэаназірання.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА
по продаже права заключения договоров аренды помещений в здании, находящемся в республиканской собственности

Аукцион состоится 16 февраля 2012 г. в 12.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 106.

Организатор аукциона – фонд «Могилевоблимущество», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 62, тел.: 8 (0222) 229022, 311185, 223375.

Продавец предметов аукциона: по лотам №№ 1–4 – республиканское унитарное предприятие почтовой связи «Белпочта», тел.: 8 (017) 2260173, 2261170; 8 (0222) 253549 – Могилевский филиал.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 8 августа 2009 г. № 1049.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 104, начиная со дня публикации извещения. Последний день приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **14 февраля 2012 г.** с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 15.00. Заключительная регистрация участников аукциона в фонде «Могилевоблимущество» **16 февраля 2012 г.** с 10.00 до 10.50.

№ лота	Сведения о предметах аукциона				Сумма задатка, руб.
	Наименование	Место нахождения	Начальная цена продажи права заключения договора аренды, руб.	Срок аренды недвижимого имущества, лет	
1.	Помещение склада, размещенное в здании склада материально-технического снабжения площадью 192,9 кв.м	Могилевская область, г. Могилев, ул. Челюскинцев, д. 178а	1 687 875	5	168 000
2.	Помещение складов, размещенное в здании склада материально-технического снабжения площадью 198,4 кв.м.		1 736 000	5	173 000
3.	Помещение кладовой и склада, размещенное в здании склада материально-технического снабжения площадью 24,4 кв.м		213 500	5	21 000
4.	Помещение котельной, размещенное в здании склада материально-технического снабжения площадью 9,6 кв.м		84 000	5	8 000

Краткая характеристика помещений:

по лотам №№ 1–4 – помещения в одноэтажном кирпичном здании склада материально-технического снабжения, имеющем электроснабжение, центральное отопление.

Предполагаемое целевое использование имущества: для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществления производства (кроме вредных производств).

Договорной коэффициент к базовой ставке арендной платы за 1 кв.м в месяц по лотам №№ 1–4 – 1,5.

Задаток перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к нему документами на расчетный счет фонда «Могилевоблимущество» № 3642900001315 в филиале № 700 – Могилевское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк», код 536, УНП 700052050.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в фонд «Могилевоблимущество» подается заявление на участие в аукционе, к которому прилагаются следующие документы:

юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица; копия платежного поручения о перечислении задатка на расчетный счет организатора аукциона;

юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; копия платежного поручения либо иного документа о перечислении задатка на расчетный счет организатора аукциона;

индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя; копия платежного поручения о перечислении задатка на расчетный счет организатора аукциона;

физическим лицом – копия платежного документа о перечислении задатка на расчетный счет организатора аукциона.

При подаче документов организатору аукциона предъявляются:

представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Датой поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, индивидуальные предприниматели, перечисленные выше, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении расчетный счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Победитель аукциона в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе затраты, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения.

Цена продажи предмета аукциона не засчитывается в арендную плату, подлежащую уплате в соответствии с законодательством.

Победитель аукциона приобретает право заключения договора аренды после оплаты стоимости предмета аукциона и возмещения затрат на организацию и проведение аукциона.

Срок заключения договора аренды – не позднее 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ. ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРЩЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказная за выпуск КАРПЕНКА Наталля.

Грамадскі савет: **НАВІЦКІ Г.В.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **БАЙКОЎ В.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **СЦЕПАНЕНКА А.М.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **ПРЭДКА С.У.**, старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Гродзенскай вобласці; **МАКСІМЕНКА С.А.**, старшыня Азярыцка-Слабадскога сельскага Савета дэпутатаў.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН: 292 21 03;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 30.015. Нумар падпісаны ў 19.30 8 лютага 2012 года.